**УДК 349.414:332/33(476.5)(091)“1647”**

# ДЭКРЭТ ПАДКАМОРСКАГА СУДА ПОЛАЦКАГА ВАЯВОДСТВА 1647 г. ЯК КРЫНІЦА ПА ЗЕМЛЕКАРЫСТАННЮ МЯШЧАН ПОЛАЦКА

***А.Б. Доўнар***
Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Рэспубліка Беларусь

*У артыкуле разгледжаны дэкрэт падкаморскага суда Полацкага ваяводства 1647 г. Суд разглядаў стрэчку шляхцічаў Глазкаў з полацкімі мяшчанамі Юрэвічамі аб межах маёнтка Княжычы. Спрэчка ўзнікла ў пачатку XVII ст. з-за таго што Абрам Лукашэвіч Юрэвіч далучыў да свайго мяшчанскага маёнтка Княжычы частку зямель шляхецкага маёнтка Княжычы-Барышова паноў Глазкаў. Справа была вырашана на карысць шляхцічаў Глазкаў. Дадзены дэкрэт сведчыць аб захаванні мяшчанскага землекарыстання ў Полацкім ваяводстве ў першай палове XVII ст. Зямельныя спрэчкі паміж полацкімі мяшчанамі і шляхтай вырашаліся ў прававым полі. Матэрыялы згаданага дэкрэта ўказваюць на існаванне практыкі заключэння бракаў паміж полацкімі і дзісненскімі мяшчанамі і паміх шляхтай і мяшчанамі.*

***Ключевые слова:*** *падкаморскі суд, землекарыстанне, мяшчане, шляхта, Полацк, 1647 г.*

Полаччына з’яўляецца самабытным своеасаблівым рэгіёнам. Адной з адметнасцяў дадзенага рэгіёна часоў ВКЛ з’яўляецца наяўнасць мяшчанскага землекарыстання. Дадзеная з’ява яскрава прасочваецца ў XVI ст. [1, с. 12; 2; 6; 7, с. 31 – 43; 8]. Як было прадстаўлена мяшчанскае землекарыстанне ў XVII–XVIII ст. пакуль з’яўляецца невырашаным пытаннем ў гістарыяграфіі.

Пэўныя звесткі аб мяшчанскім землекарыстанні на Полаччыне змяшчаюцца ў дэкрэце падкаморскага суда Полацкага ваяводства 1647 г. Суд разглядаў стрэчку шляхцічаў Глазкаў з полацкімі мяшчанамі Юрэвічамі аб межах маёнткаў Княжычы. Арыгінал дадзенага дэкрэту, які быў напісаны кірыліцай («па рускі пісаны») пакуль не выяўлены [5, арк. 975]. Захавалася копія згаданага дэкрэта ў форме выпісу ад 15 лютага 1766 г. з актавых кніг земскім судзе Полацкага ваяводства (у земскім судзе ў 1766 г. для запісу згаданы дэкрэт прадставіў каморнік Полацкага ваяводства Вінцэнт Будзько [5, арк. 975–982] (цікава, што той жа каморнік Полацкага ваяводства В. Будзько тады ж, 15 лютага 1766 г., прадставіў суду акт угоды Яна Ахрэмавіча Свалынскага з Фёдарам, Ціхнам і Львом Глазкамі ад 18 студзеня 1605 г. аб размежаванні сваіх уладанняў [5, арк. 983–986]. У копіі 1766 г. дэкрэта 1647 г. было згадана, што 3 лютага 1730 г. полацкі каморнік Юзафат Глушанін запісаў згаданы дэкрэт у актавыя кнігі земскага суда Полацкага ваяводства (у дадзены дзень земскі суд працаваў у наступным складзе: на месцы суддзі быў Марцэллі Байкоўскі, падсудак Юзэфат Антоні Селява, пісар Базылі Рыпінскі (выпіс карэктаваў і звяраў з актавай кнігай Сямкоўскі) [5, арк. 982 адв.]. Пошук дадзенага запіса 1730 г. ў актавай кнізе Полацкага ваяводства 1730 г. не прынёс станоўчага выніку [4].

Пасяджэнне згаданага падкаморскага суда Полацкага ваяводства адбылося непасрэдна на месцы зямельнай спрэчкі ў Княжычах 10 кастрычніка 1647 г. Яго дэкрэт быў завераны членамі падкаморскага суда Полацкага ваяводства: подпісам і пячаткай падкаморыя Полацкага ваяводства, скарбавага пісара ВКЛ Юзафа Кланоўскага і подпісам каморніка Полацкага ваяводства Юрыя Садоўскага [5, арк. 982 адв.].

Спрэчка ўзнікла ў пачатку XVII ст. з-за безпраўнага далучэння полацкім мешчанінам Абрамам Лукашэвічам Юрэвічам да свайго мяшчанскага маёнтка Княжычы часткі зямель шляхецкага маёнтка Княжычы-Барышова паноў Глазкаў. Але разгляд справы прыйшоў да судовага дэкрэта толькі ў 1647 г.

Позвы (павесткі) на падкаморскі суд 10 кастрычніка 1647 г. былі ўручаны за шэсць тыдняў да суда мешчаніну і радцу горада Полацк Абраму Лукашэвічу Юрэвічу ў яго маёнтку і двары Княжычы і «велебнаму айцу» манаху манастыра брацкай царквы Полацка Пахому Лукашэвічу Юрэвічу ў яго маёнтку Трэсковічах і іх «участніку» – земяніну Полацкага павета Рафалу Раманавічу Корсаку і яго жонцы Марыне Лукашоўне Юрэвічавай у іх маёнтку Княжычы-Крулеў [5, арк. 975 – 975 адв.], г. зн. справа тычылася двух братоў і сястры з мяшчанскага роду Лукашэвічаў Юрэвічаў. Позвы ў падкаморы суд былі былі ўручаны бакам генералам Полацага ваяводства Фёдарам Садоўскім.

Справа падкаморскім судом разглядалася па скарзе земяніна Полацкага ваяводства Грыгора Глазка. Прычым дадзеная справа ўжо разглядалася падкаморым Полацкага ваяводства і яна па дэкрэце «першага выязду» якраз разглядалася ў вышэйпазначаны тэрмін. А ў падкаморскі суд справа была накіравана земскім судом Полацкага ваяводства. Справа датычылася спрэчцы аб землях маёнтка Княжычы-Барышова, якія знаходзіліся ў пушчы над урочышчам над Медушным ручаём [5, арк. 975 адв.].

На суд па лісту падкаморыя з’явіліся абодва бакі: ісцец – Грыгор Глазка са сваёй даверанай асобай (умацаваным) – Стэфанам Садоўскім; і адказчык – Абрам і Пахом Лукашэвічы Юрэвічы, Рафал Корсак з жонкай і шляхціч Геліяш Свалынскі, апошні як «пагранічнік» (уласнік суседніх зямель). Спачатку перад судом і бакамі судовага працэса былі зачытаны позвы згодна з якімі быў прызначы суд. Адзначалася, што інфармацыя аб тым, што позвы былі ўручаны бакам, была занатавана 8 кастрычніка 1647 г. у земскім судзе Полацкага ваяводства па паведамленню аб гэтым генералам Мікалаям Пагоскім.

Пры разглядзе справы ўмацаваны Глазкаў прадставіў суду пісьмовыя доказы, довады сваёй праваты. Напрыклад, дэкрэт земскага суда Полацкага ваяводства ад 25 студзеня 1646 г. аб накіраванні справы ў падкаморскі суд па просьбе і па аргументах А. Юрэвіча. Як і былі прадстаўлены матэрыялы 1624 г., калі 20 мая 1624 г. старац і падданыя маёнтка *Княжычы-Барышова* паведамілі, што яшчэ нябошчык Лукаш Юрэвіч, полацкі бурмістр, пасля смерці бацькі Яна і Грыгора Глазкаў, з-за іх малалецтва і няведання, калі яны «ў розных паноў службай бавіліся», у розны час «бязпраўна» захапіў частку іх зямель і далучыў да свайго маёнтка *Княжычы-Сугданы* («пазабіраў, параспахаў, падданымі паасажываў, лясныя тавары вырабіў»). Пры гэтым былі парушаны старадаўнія межы маёнткаў. Менавіта, межы Удаўскай зямлі па ручаю «Жывая вада» аж да межаў маёнтка Свіраўшчыны шляхціча Геліяша Свалынскага, якое гранічыла з маёнткам Княжычы Глазкаў.

У пачатку судовага пасяджэння падкаморскага суда было адзначана, што па дадзенай справе Грыгор Глазка падаваў скаргу на Лукаша Юрэвіча ў земскі суд Полацкга ваяводства і ў 1646 г. Але Г. Глазка і Л. Юрэвіч дамовіліся вырашыць справу без земскага суда, а з дапамогай падкаморскага суда. Таму 20 жніўня 1647 Г. Глазка звярнуўся па дадзенаму пытанню ў суд падкаморыя Полацкага ваяводства [5, арк. 975 адв. – 976].

У доказ сваей праваты Г. Глазка прадставіў выпіс з кніг рэвізораў Полацкага ваяводства (пасля «rekuperacyi з рук маскоўскіх Полацка») віцебскага кашталяна, вількамірскага старасты, берніцкага дзержаўцы Паула Паца, пісара ВКЛ, навагрудскага падкаморыя, магілёўскага дзяржаўцы Андрэя Івановіча і троцкага цівуна і гараднічага Марціна Стравінскага

ад 1 студзеня 1579 г. (?). У дадзенай рэвізіі згадваліся шляхцічы Васілей і Ціхна Іванавічы Глазкі, у якіх пры ўзяццю Полацка ўсе дакументы, прывілеі Глазкіх загінулі ў Полацку ў іх дамах на Запалоццю: згарэлі дакументы на маёнткі Замшаны, Афанасаўшчына, Княжычы і сяло Барышова (у дакуменце пад "узяццем", хутчэй за ўсё, мелася на ўвазі захоп горада войскамі цара Івана IV Васільевіча ў 1563 г.) [5, арк. 976 адв.].

Прыналежнасць маёнтка Княжычы шляхцічам Глазкам даказваў дароўны ліст ад 12 студзеня 1601 г. нябожчыка Цімафея Іванавіча Глазкі, які быў дадзены ім свайму «братанку» Льву Глазку на маёнтак Княжычы сяло Барышова (прызнанне ў той жа дзень у гродскім судзе Полацкага ваяводства) [5, арк. 978]. Аб тым жа сведчыў прад'яўлены падкаморскаму суду выпіс з гродскага суда Полацкага ваяводства ад 7 чэрвеня 1603 г. аб увядзенні ў уладанне Льва Глазка ў маёнтак Княжычы сяло Барышова па падараванню нябожчыка Цімафея Глазка. Але хутка Леў памер і маёнтак перайшоў яго сынам Яну і Грыгору (аб чым сведчыць тэстамент Льва Глазка ад 23 верасня 1606 г., які быў прызнаны на полацкім гродскім судзе на трэці дзень па смерці Льва, а затым, 12 студзеня 1608 г., быў запісаны ў актавыя кнігі земскага суда Полацкага ваяводства). У той час Ян і Грыгор служылі ў розных паноў у Кароне Польскай і ВКЛ, а маёнтак быў у пажыццёвым («дажывотным») трыманні іх маці, а па яе смерці пана Гермагена Віскоўскага як апекуна, да іх вяртання і «дойсця лет». Як раз у гэты час Лукаш Юрэвіч і заняў спрэчныя землі [5, арк. 978]. А пасля таго, як Ян і Грыгор Глазка «лет дарозшы» са службы да дому вярнуліся, спачатку Ян Глазка, як старэйшы брат, даведаўшыся ад розных людзей і падданых маёнтка Княжычах аб шкодах землям яго маёнтка 10 мая 1619 года падаў скаргу ў суд на Лукаша Юрэвіча аб забранню зямель і папсаванню гранічных знакаў [5, арк. 978 адв.]. А пасля дамоў з службы вярнуўся Грыгор Глазка. Ён з сваім братам 13 верасня 1623 г. падзялілі паміж сабой свой маёнтак Княжычы (што было імі прызнага ў земскім судзе Полацкага ваяводства 6 кастрычніка 1623 г.). Але і пасля раздзела маёнтка абодва Глазкі падалі скаргу ў полацкі гродскі суд на Лукаша Юрэвіча аб пабранні зямель і вырабе лесу (на што у 1647 г. быў прадстаўлены выпіс з гродскіх кніг ад 12 мая 1624 г.). Пасля чаго, 13 мая 1624 г. Ян Глазка сваю частку маёнтка заставіў Паўлу Парэцкаму. А Парэцкі 3 кастрычніка 1624 г. той жа маёнтак здаў ў заставу Сямёну Чарнцу. А Чарнец, у сваю чаргу, тое «правам улеўковым» «пусціў» 13 студзеня 1627 г. Грыгору Глазку. Усе дадзеныя дакументы на заставу і «влевковыя» былі прадстаўлены ў 1647 г. падкаморыю .[5, арк. 978 адв.]. Акрамя гэтага Грыгоры Глазка, «згадзіўшыся» з сваім братам Янам, 11 студзеня 1627 г. купіў у апошняга частку яго маёнтка Княжычы . На дадзеную прадажу меўся ліст Яна Глазкі і яго прызнання пад той жа датай у земскім судзе Полацкага павета .[5, арк. 978 адв.].

Атрымаўшы маёнтак Княжычы ў сваё валоданне Грыгор Глазка пачаў судзіцца з Юрэвічам, але «суду пашкодзіла» вайна з Маскоўскім царствам (хутчэй за ўсё вайна 1632–1634 гг. (Смоленская война) Як і разгляд справы прыпыніўся ў сувязі са смерцю падсудка земскага суда Полацкага ваяводства Даніэля Шчыта Забельскага ў 1635 г., а затым пасля смерці ў 1644 г. суддзі дадзенага суда Аляксандра Тышкевіча [5, арк. 979; 10, s. 168, 194].

Справа шляхціча Г. Глазкі з мяшчанамі Юрэвічамі ізноў стала разглядацца ў земскім судзе Полацкага ваяводства толькі 20 студзеня 1646 г. Менавіта тады полацкі бурмістр Лукаш Юрэвіч прапанаваў пытанне аб спрэчных землях без ніякага рашэння земскага суду паслаць на «разсудак» полацкаму падкамораму [5, арк. 979].

Неабходна адзначыць, што для атрымання станоўчага рашэння па свайму пытанню Грыгор Глазка правёў пошук дакументаў па дадзенай справе ў актавых кнігах земскага суда Полацкага ваяводства. І па яго запыту ён 7 кастрычніка 1647 г. атрымаў даведку, што дадзенае пытанне разглядалася ў 1630, 1635, 1640 г., але не судзілася. Як і была знойдзена скарга Г. Глазка ў гродскі суд Полацкагав ваяводства ад 30 снежня 1645 г. аб спілаванні двух гранічных дубоў Л. Юрэвічам. Запыт па пошуке неабходных дакументаў праводзіў падпісак земскага суда Полацкага ваяводства Базыль Садоўскі, які перагледзіў рэестры земскага суда Полацкага ваяводства [5, арк. 979].

Полацкія мяшчане Юрэвічы ў доказ сваёй праваты прадставілі суду выпіс з кніг земскага суда Полацкага ваяводства ад 14 кастрычніка 1589 г. аб прадажы полацкім мешчанінам Васілём Грыгарэвічам Полуяновічам Лукашу Юрэвічу, яго маці і брату маёнткаў Княжыч, Трэсковіч і Удоўскай зямлі (прычым у акце згаданым акце куплі/продажу мелася абмежаванне мяшчанскага маёнтка Княжычы па ручаю Медушны, які раздзяляў Княжычы з шляхетнымі маёнткамі Сваленск\Свольна і Свіраўск\Свіраўшчына пана Геліяша Свалынскага і маёнтка Княжычы Грыгора Глазкі) [5, арк. 979 адв.].

Пасля знаёмства з дакументальнымі доказамі бакоў падкаморы разам з бакамі судовага працэса аглядалі спрэчную мяжу: гранічныя дубы, вольхі, ручаі, як і знаёміліся з мяжой з маёнткамі шляхцічаў Геліяша і Аляксандра Чаркасаў, у мясцовасці Ольсу з шляхцячамі Петрашкевічам. Спачатку 10 кастрычніка мяжу паказваў Г. Глазка [5, арк. 980]. Юрэвічы паказвалі мяжу 11 кастрычніка 1647 г. ад ракі Дрысы ад лугу Гарбачэўскім урочышчам, рознымі «урочышчамі, рубжамі, ручаямі і сухадоллем» аж да нівы Патомтава, недаходзячы вялікага сухога дуба [5, арк. 980 адв.]. Пры аглядзе мяжы фіксаваліся старажытныя гранічныя знакі. Напрыклад, «зашчэпаны» дуб на мяжы часткі маёнтка Княжычы сятры Юрэвічаў. А на адным дубе Юрэвічы адмаўлялі існаванне наяных межавых знакаў. У сувязі з чым падкаморы загадаў, пры ім «для пробы … той дуб глыбока … засякаць» для выяўлення старажытных метак [5, арк. 981]. Як і фіксаваліся новыя гранічныя знакі на клёнах, вольхах [5, арк. 981 адв.].

Г. Глазка для доказа сваёй праваты ставіў сведкаў: шляхціча Яна Выслінскага і 9 сведкаў: шасці падданых Марціяна Шчыта і трох падданых Аляксандра Шпакоўскага (1. Лаўрына Паўлуковіча, 2. Лаўрына Дзехцяра, 3. Аляксея Стасюковіча, 4.Андрэя Кухціча, 5. Якута Літвіна, 6. Мацеяша Рудаковіча, 7. Хаму Васковіча, 8. Фёдара Піліпёнка, 9. Андрэя Мікулёнка) [5, арк. 979 адв.]. Пр чым над час пасяджэнняў падкаморскага суда апрашвалі кожнага сведку асобна [5, арк. 981 адв.].

У сваю чарку адказчык, Абрам і Похомі Лукашэвічы Юрэвічы, разам з Корсакам (як прадстаўнік жонкі) у свой доказ прадставілі дакументы продажу полацкага мешчаніна Васіля Грыгаровіча Полуяновіча на маёнтак Княжычы, Удаўское і Трэсковічы бурмістравай дзісенскай Аўдоці Іванавае Палуянаўне Іванавай Юрэвічавай і яе сынам Івану, Куцене і Лукашу Іванавічам Юрэвічам за 300 коп літоўскім (з апісаннем мяжы дадзеных маёнткаў) [5, арк. 979 адв.]. Як і Абрам Юрэвіч прадставіў суду двух сведкаў, але яны былі «*в повесці незгодныя з сабою*». Але А. Юрэвіч станавіўся да прысягі сам, з сястрой і шасцю сведкамі (падданымі іншых маёнткаў). [5, арк. 981а].

Г. Глазка прасіў суд аднавіць старажытныя межы і прызначыць кампенсацыю шкод:

–за шкоды за адзін год за тыя землі па 20 коп грош літоўскіх з разліку забрання зямель ад 1607 да 1647 г.;

– за спілаванне дубоў на клепкі і ванчос, які я былі прыдатныя на доскі – за 380 дубоў за кожны па 1 капе;

– за іншае дрэва – 1086 пней/штук па 6 грошай;

– асобна за спілаванне двух гранічных дубоў і за папсаванне межаў па 18 артыкулу 9 раздзела Статута ВКЛ 1588 г. гвалту 20 коп і кошт дубоў па Статуту.

Спагнянне дадзеных шкод і штрафаў Г. Гласка прасіў прызначыць з патомкаў Лукаша Юрэвіча і тых маёнтках, ў якіх былі ўручаны ім позвы [5, арк. 981а]. Юрэвічы абараняліся артыкулам 91 раздз. 4 Статута ВКЛ 1588 г. аб земскай даўнасці.

Падкаморскі суд Полацкага ваяводства разгледзіў дадзеную справу аб парушэнні старазвечных межаў і забранню зямель яшчэ нябошчыкам Лукашам Юрэвічам у Глазкоў і прыняў рашэнне на карысць Глазка. Дадзенае рашэнне было прынята ў сувязі з тым, што мяшчане Юрэвічы «*нічога на пісьме да сваёй абароны не паказалі*», сведкаў не ставілі, *судовых дакументаў не мелі, слушных гранічных знакаў не паказалі*, а абараняліся *толькі даўнасцю карыстання землялі*, сваімі паказаннямі і сведчаннямі падданых сваёй сястры, хоць і былі згодны прысягнуць. А Г. Глазка свае дзедзічныя правы доказваў дакументамі: «беручы сабе на дапамогу і агранічэнне» з дакументаў мяшчан Юрэвічаў у «праве купным» ад Палуяновіча іменне Княжычы, Трэсковічы. Як і Глазка доказваў сваю правату яўнымі старажытнымі гранічнымі знакамі. Пры чым паказанні Глазкі былі падцверджаны паказаннямі сведкаў. У сувязі з чым да прысягі падкаморым судом быў дапушчаны (як бок з большымі довадамі) асабіста Г. Глазка з трыма сведкамі, якіх выбралі Юрэвічы [5, арк. 982].

Па выкананню прысягі падкаморы суд зацвердзіў старажытныя межы маёнтка Глазкаў Княжыч-Барышова і спрэчныя землі прысудзіў вечна Глазкам. Па дадзенаму дэкрэту мяшчане Юрэвычы «свой жытні засевак» у сваіх падданых, які быў бы зжаты ў будучым 1648 г. як і сваіх падданых з тых зямель мелі права забраць. Пытанне кампенсацыі шкод было не вырашана, а адаслана ў належны суд. Дэкрэтам дапускалася апеляцыю да Трыбунала ВКЛ у Вільні ў 1648 г. [5, арк. 982]. Такім чынам, дэкрэт 1647 г. дазваляе сцвярджаць, што падкаморскі суд Полацкага ваяводства дзейнічаў ў адпаведнасці з правам і існуючай традыцыяй дзейнасці падкаморскіх судоў у ВКЛ [3, с. 370, 371, 374–275, 375, 396; 9].

Дэкрэт 1647 г. падкаморскага суда Полацкага ваяводства сведчыць пра існаванне полацкага мяшчанскага землекарыстання ў першай палове XVII ст. І хоць справа 1647 г. датычылася шляхецкага маёнтка, але згаданае мяшчанскае землекарыстанне, як і права мяшчан сяліць на сваіх землях падданых не выклікала ні ў кога сумненняў і пярэчанняў – прэтэнзіі тычыліся безпраўнаму заняццю чужой зямлі. Матэрыялы першай паловы XVII ст., якія змешчану ў дэкрэце падкаморскага суда Полацкага ваяводства 1647 г., сведчаць, што зямельныя спрэчкі паміж шляхтай і мяшчанамі бакі імкнуліся вырашаць у прававым полі і для гэтага звярталіся ў адпаведны гродскі, земскі і падкаморскі суд, што сведчыць пра высокі прававы статус мяшчанскіх зямел.

Матэрыялы згаданага дэкрэта ўказваюць на існаванне практыкі заключэння бракаў паміж полацкімі і дзісненскімі мяшчанамі (брак полацкага мешчаніна Івана Юрэвіча з дачкой дзісенскага бурмістра Івана Палуяновіча Аўдоццяй – другая палова XVI ст.) і паміх шляхтай і мяшчанамі (брак Рафала Раманавіча Корсака з мяшчанкай Марынай Лукашоўнай Юрэвічавай – першая палова XVII ст.). Пры чым дадзеныя бракі былі адным з шляхоў пераразмеркавання зямельнай уладанняў. Так, Марына Лукашоўна Юрэвічава, вышаўшы замуж за Рафала Корсака, прынесла яму сваю частку мяшчанскага маёнтка Княжычы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Варонін В. Рэвізія Полацкага ваяводства 1552 года / В. Варонін. – Вільня: Інстытут беларусістыкі; Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства, 2011. – 268 с.
2. Варонін В. Мяшчанскае землеўладанне ў Полацкім ваяводстве у І-й палове XVI ст.// Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. матэрыялы ІІІ міжнар. навук. канф. Полацк, 1998. – С. 58–63.
3. Лаппо И. И. Подкоморский суд в Великом княжестве Литовском в конце XVI и начале XVII века // Журнал министерства народного просвещения – Спб., 1899, август. – С. 341 – 403.
4. НГАБ. – Ф. 1778. – Воп. 1. – Спр. 17. – 857 арк.
5. НГАБ. – Ф. 1778. – Воп. 1. – Спр. 22. – 992 арк.
6. Панов В.А. Социальный строй Полоцкой земли по данным «Полоцкой ревизии 1552 года» // Журнал министерства народного просвещения. 1915. No 4. С. 209–263; No 5. С. 1–64.
7. Полацкая рэвизия 1552 г. К изд. подготовил И.И.Лаппо. Адб. З “Чт. В Об-ве ист. И древн. Рос.”, 1905, кн.2, с.1 – 236.– М.: изд. Общества ист. и древ. Рос., 1905. – 236 с.
8. Спірыдонаў М.Ф. Полаччына ў сярэдзіне XVI ст. // Commentarii Polocenses Historici – Полацкія Гістарычныя Запіскі. Т. 1. Polociae Novae – Mensci, 2004. С. 5–19.
9. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Тэкст. Даведнік. Каментарыі /Рэдкал.: і.П.Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.
10. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. – T. V. – Ziemia Połocka i woiewództwo połckie XIV – XVIII wiek. Pod red. H. Lulewicza. – Warszawa. 2018. – 303 s.


## THE PADKAMORSKY COURT DECREE OF THE POLATSK VOIVODESHIP 1647 AS A SOURCE FOR THE LAND USE OF THE POLATSK MESHCHANE

***A. Dounar***

*The article examines the Padkamorsky Court decree of the Polatsk Voivodeship 1647. The court examined the dispute between gentrys the Glazkas and Polatsk meshchane the Yurevichs about the Knyazhychy estate boundaries. The dispute arose at the beginning of the 17th century due to the fact that Abram Lukashevich Yuryevich annexed to his meshchan estate Knyazhychy part of the gentry estate Knyazhychy-Baryshova of pans the Glazskys. The case was resolved in favor of gentry the Glazkas. This decree testifies to the preservation of meshchan land use in the Polatsk Voivodeship in the first half of the 17th century. Land disputes between Polatsk meshchans and the gentry were resolved in the legal field. The aforementioned decree materials indicate the existence of marriages between Polatsk and Disna meshchans and mixed gentry and meshchans marriages.*

***Keywords:*** *Padkamorsky Court, Land Use, Meshchans, Gentrys, Polatsk, 1647.*